Пралетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

# ЧЫРВОНЫ СЦЯГ

Орган Давід-Гарадоцкага РК КП(б)Б і Райвыканкома.

№ 10(14) Нядзеля 4 сакавіка 1945 года

Цана 15 кап.

ПОЎНАЯ ПЕРАМОГА НАД НЕМЦАМІ ЎЖО БЛІЗКА. АЛЕ ПЕРАМОГА НІКОЛІ НЕ ПРЫХОДЗІЦЬ САМА,—ЯНА ЗДАБЫВАЕЦЦА Ў ЦЯЖКІХ БАЯХ І ВА ЎПОРНАЙ ПРАЦЫ.

І. СТАЛІН.

## Загад правадыра—у масы

З вялікай радасцю і натхненнем сустрэў совецкі народ загад таварыша Сталіна ў сувязі з 27-й гадавінай Чырвонай Арміі. На многалюдных мітынгах, прысвечаных загаду правадыра, народ выражае бязмежную любоў к сваей арміі-вызваліцельніцы, якая „... выратавала народы Совецкага Саюза ад нямецка-фашысцкага рабства, адстаяла свабоду і незалежнасць нашай Радзімы і дапамагла народам Еўропы скінуць нямецкае іга"

Загад Вярхоўнага Галоўнакамандуючага вызваў сярод працаўнікаў тыла новую хвалю вытворчага ўздыму.

Усімі сіламі дапаможам Чырвонай Арміі хутчэй дабіць ворага,—так заяўляюць на сваіх мітынгах працоўныя.

Рабочыя судаверфі далі слова паспяхова выканаць вытворчы план і квартала і датэрмінова закончыць рамонт некалькіх барж. Сяляне Лядзецкага і Рубельскага сельсоветаў абавязаліся к 5 сакавіку поўнасцю разлічыцца па ўсіх плацяжах, своечасова адрамантаваць сельскагаспадарчы інвентар, добра падрыхтавацца к веснавой сяўбе.

Задача партыйных і комсамольскіх арганізацый, агітатараў і інтэлігенцыі паўсямесна разгарнуць вывучэнне загада таварыша Сталіна. Раз'ясніць працоўным, што для хутчэйшай перамогі над ворагам трэба працаваць не пакладаючы рук. У даны момант, калі,—„поўная перамога над немцамі ўжо блізка„ —трэба ўдзесяцярыць дапамогу фронту—такава задача кожнага совецкага грамадзяніна.

Пры вывучэнні загада таварыша Сталіна трэба скарыстоўваць усю мабілізуючую сілу гэтага гістарычнага дакумента на вырашэнне канкрэтных задач, стаячых перад кожным прадпрыемствам, установай, вёскай.

Загад правадыра прызывае і натхняе народ на новыя працоўныя подвігі ў імя блізкай перамогі над праклятым ворагам.

## БАЯВЫМІ СПРАВАМІ АДКАЖАМ НА ЗАГАД ПРАВАДЫРА! УСЕ СІЛЫ НА ДАПАМОГУ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ!

### МІТЫНГ РАБОЧЫХ СУДАВЕРФІ.

Як толькі на судаверфі быў атрыман загад Вярхоўнага Галоўнакамандуючага таварыша Сталіна аб 27-ай гадавіне Чырвонай Арміі, адбыўся мітынг рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых судаверфі.

З вялікай увагай было выслухана кожнае слова загада, у якім таварыш Сталін даў яркі аналіз пераможнага наступлення Чырвонай Арміі.

Загад вялікага Сталіна вызваў новы вытворчы ўздым сярод усяго калектыва судаверфі.

„Поўная перамога над немцамі цяпер ужо блізка. Але перамога ніколі не прыходзіць сама,—яна здабываецца ў цяжкіх баях і ва ўпорнай працы". Гэтыя словы загада таварыша Сталіна патрабуюць ад нас, суднабудаўнікоў, працаваць яшчэ лепш.

У адказ на загад правадыра суднарамонтная брыгада майстра Кузьмiча абавязалася датэрмінова выпусціць з рамонта дзве баржы.

Увесь калектыў судаверфі даў абавязацельства паспяхова закончыць выкананне вытворчай праграмы 1-га квартала па берагавому будаўніцтву і будаўніцтву новых суднаў, узняць вытворчасць працы, даць краіне больш суднаў.

Сіманенка.

### НАШ АДКАЗ НА ЗАГАД ПРАВАДЫРА

Па ўсіх прадпрыемствах і установах горада і вёсках раёна праходзяць мітынгі, прысвечаныя загаду таварыша Сталіна.

Загад таварыша Сталіна вызваў сярод працоўных законную гордасць за нашу слаўную Чырвоную Армію, новы вытворчы ўздым. Працоўныя адказваюць яшчэ лепшай работай па выкананню фронтавога задания па лесанарыхтоўкам і лесавывазцы, датэрміновым выкананнем усіх абавязкаў перад дзяржавай.

Жыхары Лядзецкага сельсовета абавязаліся к 5 сакавіку поўнасцю разлічыцца па ўсім відам нарыхтовак, па-бальшэвіцку падрыхтавацца і правесці веснавую сяўбу, даць Чырвонай Арміі больш хлеба і іншых прадуктаў.

П. Скрабец.

### ЯШЧЭ ЛЕПШ БУДЗЕМ ПРАЦАВАЦЬ.

Сяляне вёскі Рубель сустрэлі загад правадыра новым працоўным уздымам. Закіпела работа адпабудове спаленай нямецкімі захопнікамі вёскі. На другі дзень пасля зачыткі загада таварыша Сталіна, 100 падвод выехала для перавозкі дамоў пад школу, сельскі совет, для сямей чырвонаармейцаў, партызан і інвалідаў Айчыннай вайны.

Сяляне Рубельскага сельсовета, закончыўшы выкананне плана лесанарыхтовак і лесавывазак, абавязаліся к 5 сакавіку поўнасцю разлічыцца па ўсім відам плацяжоў.

Шэрстнёў.

## К ПРАВЯДЗЕННЮ МІЖНАРОДНАГА ЖАНОЧАГА ДНЯ

Пачалася падрыхтоўка к правядзенню Міжнароднага жаночага дня-8 сакавіка.

У гэты дзень ва ўсіх населённых пунктах і райцэнтры адбудуцца сходы жанчын, на якіх будуць заслуханы даклады і бяседы аб Міжнародным жаночым дні.

Райком партыі вылучыў дакладчыкаў па гэтаму пытанню.

## ХАТА—ЧЫТАЛЬНЯ Ў в. РУБЕЛЬ

У вёсцы Рубель, якая была поўнасцю спалена нямецка-фашысцкімі пагромшчыкамі, пачала работу хата-чытальня.

Сяляне атрымалі магчымасць у хаце-чытальні пачытаць газеты, кніжкі, праслухаць гутарку.

Загадчык хаты-чытальні, камсамолец, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны т. Зіноўчык Пётр з вялікай энергіяй узяўся за работу.

У хаце-чытальні налічваецца 103 экземпляры розных кніжак, выпісваецца 13 газет, 6 журналаў.

С. Ключнікаў.

## ПАВЫШАЕМ КВАЛІФІКАЦЫЮ

У нас, у аддзяленні дзяржбанка, дзе я працую, многія работнікі ніколі не працавалі на рахунковай рабоце, маюць зусім нізкі ўзровень ведаў, што ўплывае на нармальную работу.

Каб ліквідаваць гэты недахоп, калектыў служачых упарта ўзяўся за павышэнне сваёй дзелавой кваліфікацыі. Арганізаван гурток па тэхмінімуму у якім рэгулярна, два разы ў тыдзень, праводзяцца заняткі па вывучэнню інструкцый. Гурток наведваюць 10 чалавек. Заняткі, якія праводзіць кіраўнік аддзялення тав. Шэрстнёў, праходзяць цікава і даюць нам вялікую карысць у штодзённай рабоце. Выкладчык проста і ясна расказвае матэрыял, звязваючы яго з практычнай работай.

Теслюк Люба.

## ЗАБЫТАЯ ШКОЛА

У НСШ № 2 г. Давід-Гарадка многія вучні жадаюць быць піонерамі, але да сяго часу піонерскай арганізацыі няма.

Раённы камітэт камсамола мабыць забыўся аб гэтай школе, што да гэтага часу не падбярэ важатага.

Суркоў.

## Аб'ява

Прадаўжаецца падпіска на раённую газету

**„ЧЫРВОНЫ СЦЯГ“**

**Падпісная плата:**

**за 1 месяц—1 руб. 30 к.**
**за 3 месяцы—3 руб. 90 к.**
**за 6 месяцаў—7 руб. 80 к.**

**Падпіска прымаецца ўсімі паштовымі аддзяленнямі і раённым аддзяленнем „Саюздрук“.**

# На франтах Айчыннай вайны.

## (АГЛЯД ВАЕННЫХ ДЗЕЯННЯЎ за час з 20 па 27 лютага 1945 года)

На Земландскім паўвостраве, на захадзе ад Кенігсберга, нашы войскі адбівалі атакі буйных сіл пяхоты і танкаў праціўніка. Цаной вялікіх страт у жывой сіле і тэхніцы яму ўдалося 22 лютага пацясніць нашы часці ад паўночнага ўзбярэжжа Кенігсбергскай бухты. У трохдзённых баях—з 19 па 21 лютага,—нашы войскі на захадзе ад Кенігсберга знішчылі 86 нямецкіх танкаў і самаходных гармат, 76 палявых гармат, 160 кулямётаў і звыш 300 аўтамашын. Праціўнік страціў толькі забітымі больш 8000 салдат і афіцэраў.

На паўднёвым захадзе ад Кенігсберга нашы войскі вялі баі па знішчэнню ўсходне-прускай групоўкі праціўніка і, сціскаючы кальцо акружэння, занялі рад населеных пунктаў. У выніку жорсткіх баёў савецкія часці авалодалі горадам Фінтэн,—моцным апорным пунктам абароны немцаў. У баях за Фінтэн нашы войскі знішчылі да 4000 варожых салдат і афіцэраў, знішчылі 41 танк, 10 бронетранспарцёраў і 60 гармат. Захоплена 40 гармат, 108 кулямётаў і іншыя трафеі. Узята ў палон 520 немцаў.

Войскі 2-га Беларускага фронта авалодалі горадам Чэрск—важным вузлом камунікацый і моцным пунктам абароны немцаў у паўночна-заходняй частцы Польшы. У баях за Чэрск знішчана да 2000 нямецкіх салдат і афіцэраў, 11 танкаў і самаходных гармат. Захоплена 26 гармат і іншыя трафеі. Войскі фронта, прадаўжаючы наступленне на захад ад горада Хойніцэ, зламалі супраціўленне праціўніка і за 4 дні наступальных баёў прасунуліся ўперад да 70 кілометраў. У ходзе наступлення савецкія часці занялі на тэрыторыі Памераніі гарады Шлохау, Штэгэрс, Хамерштайн, Бальдэнберг і Бубліц—важныя вузлы камунікацый і моцныя апорныя пункты абароны немцаў.

Войскі 1-га Беларускага фронта пасля месячнай асады і ўпорных баёў завяршылі разгром акружанай Пазнаньскай групоўкі праціўніка і 23 лютага поўнасцю авалодалі гарадамі і крэпасцю Пазнань—стратэгічна—важным вузлом абароны немцаў на Берлінскім напрамку. У ходзе баёў у Пазнані нашы войскі захапілі ў палон 23000 нямецкіх салдат і афіцэраў. У палон узят таксама камендант крэпасці генерал-маёр Матэрн разам з яго штабам. Захоплены багатыя трафеі, у тым ліку 365 самалётаў, 32 танкі і самаходных гармат, 584 палявых гармат, 4490 кулямётаў, звыш 30000 вінтовак і аўтаматаў, 36 бронетранспарцёраў, 3260 аўтамашын, 21 радыёстанцыя, 193 паравозы і 3705 вагонаў. Праціўнік страціў толькі забітымі звыш 25000 салдат і афіцэраў. Пазнань з'яўляецца буйным прамысловым цэнтрам. У час вайны немцы пабудавалі ў горадзе рад ваенных заводаў і, акрамя таго, эвакуіравалі сюды некаторыя ваенныя прадпрыемствы з розных гарадоў Германіі. Да Пазнані выходзяць 8 чыгунак і шмат шасейных дарог.

У правінцыі Брандэнбург нашы войскі з баямі занялі гарады Пфёртэн, Губус і вышлі да ракі Нейсе, на поўдні ад горада Гудэн. У лясах на паўднёвым усходзе ад Гудэна савецкія часці ліквідавалі акружаную групу праціўніка, колькасцю ў 2000 салдат і афіцэраў. У горадзе Брэслау нашы войскі вялі баі па знішчэнню акружанай групоўкі праціўніка і занялі рад кварталаў. 20 лютага савецкія часці захапілі ў паўднёвай частцы горада 130 нямецкіх гармат, у тым ліку 80 гармат вялікай магутнасці.

За час з 20 па 26 лютага нашы войскі на ўсіх франтах надбілі і знішчылі 936 нямецкіх танкаў. У паветраных баях і агнём зянітнай артылерыі збіта 240 самалётаў праціўніка.

Адказны рэдактар А. Плаўчапка.

Адрас рэдакцыі: г. Давід-Гарадок, вул. Карла Маркса, 10.